Д-т. Зовн. Торгу
Вх 565
29/х-19 р.

1

Беларуская Народная Рэспубліка
Надзвычайны Пасол
пры Украінскім Урадзе.
Жовтня 28 дня 1919 року.
№ 39

Высокашановнаму Пану Дірэктару Заўнешняго Торгу.

Старое добрае суседства Украінскага і Беларускага народаў; супольнасць нацыянальна-політычных і культурна-эканамічных інтэрэсаў - з даўніх часоў выявлялі патрэбнасць найтеснейшых зносін і меж іншым досіць шырокага тавараабмену прамеж абодвымі народамі. Астаннія важкія варункі жыцьця прыпінілі зовсім таргавельныя зносіны, што значна атчуваецца у нас на бацькаўшчыне. Не будзе памылкі, калі скажем, што непрысутнасьць тавараў ат Беларусі так сама атчуваецця і сярод украінскага грамадзянства.

Беларускае пасольства меіць на мецi зрабіць усі патрэбныя заходы, каб наладзіць гэтый патрэбный тавараабмен.

Мы бажаем васстанавіць тарговыя дагаворы, якія былі апрацованы ў Кііве ў часы ўлады Дірэкторіи, а так сама пазнаеміўшысь дакладно, пры Вашей ласкавай дапамоге, з украінскай прамысловасьцью і рынкам, еще пашырыць тавараобмен і прыспасобіць сваю прамысловасьць для экспорту к вырабу тых тавараў, якія будуць мець збыт на Украіну.

З сваего боку мы лічым мажлівым прапанаваць гэтакіе тавары:

а/ Рожный древляной, будавляный і крепежный матэрiал;

б/ Льняную, пеньковую і суконнаю мануфактуру, шкураный тавар і мыдло;

в/ Льняное масла, алей, хмель, яблокі, грыбы і іншыя гаспадарскія прадукты;

г/ Вырабы ат сухой перегонкі древа древляный спірт, тэрпэнтін, дёгаць, нафталін і іншые;

д/ Вырабы ат древяной массы: цэллюлеза, кардон, папера, паперовыя ткані і іншые;

105

е/ Прадукты сінтэза арганічных матэрьялаў: лекарскіе, фарбовачныя і ўзрнучатыя речы і іншые препараты арганічнай технаогіі;

ж/ Серняці, фанеру і паркет;

з/ Вырабы менеральнай техналогіі: шкло, цэмент, суперфасфат і іншые.

Гэта глаўнейшыя прадукты, якія Беларусь мусіць прапанаўаць для экспорту.

Просім Вас разглядзець нашу прапазіцыю і паведаміць пасольства якія з переліченых і аналегічных ім тавараў, і вызначіть пріблізно ў яком ліку, будуць патрэбны для імпорта на Украіну.

З сваяго боку Беларусь завсегда будзець мець спрос на украінскій цукер, пшеніцу, цюцюн, поснае масло, зялеза і яго рожные вырабы /асабліва для гаспадарства/, вугаль, жівелу /худобу/.

У найблізшій час нам потрэбны:

а/ цукру................50.000 пуд.
б/ пшеніцы........... 200.000 пуд.
в/ цюцюна /легкаго/...   3.000 пуд.
г/ цюцюна /махоркі/...   5.000 пуд.
д/ поснаго масла......  20.000 пуд.
е/ Залеза..........
ж/ Вугля...........  } Вялікій спрос.
з/ Жівелы /худобы/: I/коней.......50.000 шт.
2/рагат. скот..80.000 шт.
3/свіней......20.000 шт.
4/Овец тонкаш.25.000 шт.

Просім Вас Высокашаноуный Пане Дірэктор паведаміць пасольства што і у яком ліку і пріблізна па якім цанам Вы можете прапанаваць для экспорта на Беларусь.

Г. В. О. Пасла на Украіне
Радца Пасольства А. Цвікевіч

Сакратар
[signature]